# СЦЭНАРНАЯ РАСПРАЦОЎКА КЛАСНАЙ ГАДЗІНЫ ДЛЯ ВУЧНЯЎ 2-4 КЛАСАЎ

В.П.Жыбурт, настаўнік пачатковых
класаў ДУА "Ганцавіцкая сярэдняя
школа імя Героя Савецкага Саюза
А.П.Брынскага"

## Гульня-падарожжа
## "Край свой родны абыйду, скарбы розныя знайду"

**Мэта:** выхаванне грамадзяніна і патрыёта сваёй малой Радзімы на сапраўдных каштоўнасцях беларускага народа.

**Задачы:** пашырыць веды пра Рэспубліку Беларусь; развіваць пазнавальную актыўнасць; садзейнічаць фарміраванню патрыятызму і любові да малой Радзімы, павагі да яе гісторыі і сучаснасці, культуры, мовы, традыцый.

**Абсталяванне:** сімволіка Рэспублікі Беларусь, краязнаўчыя інфармацыйныя матэрыялы, мультымедыйнае абсталяванне, раздатачны матэрыял.

**Афармленне дошкі:**

*Назва класнай гадзіны – Дадатак 1*

*Паветраны шар – Дадатак 2*

*Разгорнутая кніга –Дадатак 3*

*Малюнкі герояў Буквара Жэўжыка і Кірыліцы – Дадаткі 4, 5 [1].*

*Фотаздымкі знакамітых людзей – Дададкі 9, 10*

Дадаткі 1-3, 6-10 выкананы на сайце www.canva.com

Дадатак 11 выкананы на сайце https://wordart.com/

## Ход гульні

**1. Арганізацыйны этап. Слайд 1**

*Настаўнік.* Я сардэчна ўсіх вітаю. І на класную гадзіну запрашаю.

Якія вы ўсе прыгожыя і святочна апранутыя! Давайце я здагадаюся, чаму ж вы сягодня так радуецеся. Калі здагадка правільная, выканайце мае заданні. Дамовіліся?

Калі вы рады, што сустрэліся са сваімі аднакласнікамі і настаўнікам, павітайцеся з суседам.

Калі вы радуецеся, што да нас завіталі госці, пляскайце ў далоні.

Калі вам крыху страшнавата, павярніцеся тварам да гасцей і ўсміхніцеся.

Калі вы спадзяваецеся, што сёння вас чакае цікавая класная гадзіна, пакажыце, як навучыліся сябе паводзіць на школьных уроках.

**2. Асноўны этап.**

**Практыкаванне “Сурвэткі”**

*Настаўнік.* На вашых сталах ляжаць папяровыя сурвэткі. Вазьміце, калі ласка, па адной і згарніце яе напалову любым спосабам. Адарвіце з любога краю вугалок. Згарніце яе яшчэ раз напалову і зноў адарвіце кавалачак з любога вугалка. Згарніце ў трэці раз напалову і зноў адарвіце. А цяпер разгарніце і прадэманструйце тое, што ў вас атрымалася.

Наўрад ці знойдзецца пара сурвэтак, на якіх паўтараецца малюнак. Як вы думаеце, чаму мы атрымалі такі вынік [2]?

*Дзеці адказваюць.*

*Настаўнік.* Кожны чалавек унікальны, ён валодае толькі яму уласцівымі якасцямі. Але, нягледзячы на тое, што мы такія розныя, многае нас аб’ядноўвае.

Як вы лічыце, што можа аб’ядноўваць нас з вамі?

*Адказы дзяцей.*

*Настаўнік.* Так, усе мы – жыхары адной краіны. Звярніце ўвагу, як гучыць тэма класнай гадзіны. Прачытаем яе разам –“Край свой родны абыду, скарбы розныя знайду”.

Сёння мы пагаворым пра хараство беларускай прыроды, разнастайнасць рамёстваў, багацце роднай мовы, пра славутых людзей нашай Бацькаўшчыны.

На класную гадзіну да нас завіталі Жэўжык і Кірыліца. Ім вельмі хочацца палюбавацца прыгажосцю нашай краіны, паляцеўшы на паветраным шары. Каб трапіць на шар трэба выканаць шмат заданняў. Але Жэўжыку і Кірыліцы адным не справіцца. Давайце ім дапаможам. Падзелімся на дзве каманды: адна каманда будзе дапамагаць Кірыліцы, а другая – Жэўжыку. Кожны ваш правільны адказ наблізіць пачатак палёту на паветраным шары.

*Для заахвочвання вучняў, іх актывізацыі пасля выканання кожнага задання малюнкі Жэўжыка і Кірыліцы падымаюцца на дошцы да паветранага шара.*

**Літары згубіліся.**

Настаўнік. Ці заўважалі вы калі-небудзь, на якой прыгожай зямлі мы жывём? Якая багатая яна на звычаі і традыцыі, якую славутую гісторыю мае, колькі знакамітых людзей нарадзіла! Мае маленькія беларусы, паспрабуйце паказаць сваю эрудыцыю. Пашукайце прымацаваныя да парты ці свайго стула літары. Падыдзіце да дошкі і складзіце з літар назву Радзімы [3].

**Наша краіна – Рэспубліка Беларусь (Дадатак 6). Слайд 2**

*Настаўнік.* Так як у кожнага з вас ёсць імя, так і краіны маюць свае назвы. Нашу краіну можна назваць па-рознаму. Запрашаю па аднаму вучню з кожнай каманды ўспомніць словы-назвы нашай краіны. Са складоў складзіце словы, якімі можна яе назваць.

*Настаўнік.* Вы дапамаглі Жэўжыку і Кірыліцы, і яны робяць першы крок на паветраны шар.

**Экспрэс-апытанне**

*Настаўнік.* Каб вырасці годным чалавекам і грамадзянінам, трэба ведаць сваю Радзіму. Наступнае заданне для каманд – экспрэс апытанне: за 1 мінуту неабходна адказаць на большую колькасць пытанняў аб Беларусі.

1. Наша краіна называецца…Рэспубліка Беларусь
2. *Хто з'яўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь?... А.Р.Лукашэнка*
3. Сталіца Беларусі – горад …МІНСК
4. *Наш абласны цэнтр – горад… Брэст*
5. Назавіце дзяржаўныя мовы Беларусі… Беларуская, руская
6. *Назавіце дзяржаўныя сімвалы…Герб, флаг і гімн*
7. Як называюць жыхароў Рэспублікі Беларусь?...Беларусы
8. *Колькі абласцей уваходзіць у склад нашай краіны?...6*
9. Колькі чалавек пражывае ў Беларусі?... Крыху больш за 9 мільёнаў
10. *Недалека ад нашай вескі знаходзіцца горад… Ганцавічы*
11. У якім раене знаходзіцца вёска Ганцавічы?... Ганцавіцкім
12. *Назавіце краіны, з якімі мяжуе Беларусь... Расія, Украіна, Польша, Літва, Латвія*
13. Назавіце вобласці Беларусі?... Гродзенская, Магілёўская, Віцебская, Гомельская, Брэсцкая, Мінская
14. *Як называецца асноўны закон нашай дзяржавы?... Канстытуцыя*
15. Якія колеры прысутнічаюць на сцягу Беларусі?.. Чырвоны, зялёны, белы
16. *Што азначае зяленая паласа на беларускім сцягу?... Зялёны колер – гэта колер прыроды. Гэта колер палеў і лясоў, якія здаўна займалі асноўную частку тэррыторыі нашай краіны. Зялёны колер – колер дабра, развіцця, дабрабыту і міра*
17. Які від транспарта ёсць толькі ў Мінску?... Метро
18. *Беларусь называюць зямлёю з блакітнымі вачыма, таму што тут шмат… Азёр, рэк*
19. Па форме Беларусь нагадвае ліст клёна. Таму яе называюць … "Зялёны лісток"
20. *Вельмі любяць нашу зямлю буслы, а селяцца яны толькі там, дзе жывуць добрыя людзі. Вось і называюць нашу рэспубліку… "Зямля пад белымі крыламі"*
21. Возера – жамчужына Беларусі?... Нарач
22. *Назавіце самую буйную раку Беларусі... Дняпро*
23. Самая буйная рыба нашых вадаемаў?... Сом
24. *Самы старажытны горад… Полацк*
25. Горад беларускіх шахцёраў... Салігорск

*26. Калі адзначаецца Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?... 15 сакавіка*

27. Калі адзначаецца Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь?... 3 ліпеня

*28. Калі беларускае поле бывае блакітным?... Калі цвіце лён*

29. Якое дрэва ў Беларусі называюць мядовым?... Ліпа

*30. Самая буйная жывёла Беларусі ...Зубр*

31. Якое дрэва ў Беларусі найбольш распаўсюджанае?... Сасна

*32. Якое дрэва у Беларусі называюць дрэвам-шаптуном?... Асіна*

**Добрыя і ветлівыя словы (Дадатак 7). Слайд 3**

*Настаўнік.* Няма нічога лепшага за мову, якая завецца роднай. Менавіта на ёй чалавек размаўляе з сябрамі, роднымі, знаёмымі. Беларуская мова чаруе, вабіць сваёй прыгажосцю, мілагучнасцю і непаўторнасцю. Прачытайце словы, надрукаваныя на яблычках. Давайце збяром у кошык добрыя і ветлівыя словы беларускай мовы. Будзьце ўважлівыя. Прымацуйце на дошку толькі тыя словы, якія я буду называць:

– Пакладзіце ў кошык словы, якімі можна вітацца *(прывітанне, добрай раніцы, добры дзень).*

– Якія словы гаворым, калі кладзёмся спаць? *(дабранач)*

– Як сказаць па-беларуску: давайте познакомимся, мне очень приятно, пожалуйста.

– Як папарасіць прабачэння на роднай мове? *(прабач, даруй, я прашу прабачэння).*

– Успомнім словыпадзякі*(дзякуй, сардэчна дзякую).*

**Наш гонар. Слайд 4**

*Настаўнік.* Праверым, ці памятаеце вы, якімі дасягненнямі ганарацца беларусы. Вам трэба прысесці каля парты, калі пачуеце правільны адказ на пытанне. *Трэніроўка.* Наша краіна называецца Англія, Рэспубліка Беларусь, Амерыка.

1. Птушка-сімвал Беларусі: лебедзь, верабей, **бусел.**

2. Самая папулярная беларуская агародніна. Другі хлеб беларусаў. Бурак, **бульба**, морква.

3. З валокнаў гэтай расліны ткалі палатно і шылі адзенне, да гэтага часу гэтая тканіна вельмі папулярная і запатрабаваная ва ўсім свеце. **Лён**, канюшына, рамонак.

4. Гэтыя трактары вядомыя далёка за межамі нашай Радзімы. Выпускаюцца на Мінскім трактарным заводзе. Кіравец, **Беларус,** Джандзір.

5. Вялікагрузныя магутныя самазвалы з Беларусі, вядомыя ва ўсім свеце. Выпускаюцца ў Жодзіна. Мазы, Пазы, **Белазы.**

6. Тэлевізары, якія выпускаюцца ў Мінску. Самсунг, **Гарызонт**, Віцязь.

7. Прадукцыя гэтых знакамітых беларускіх брэндаў – шакалад і цукеркі. Славянка, **Камунарка, Спартак.**

8. Філіял прадпрыемства “Берасцейскі пекар”, што знаходзіцца ў Ганцавічах, выпускае **хлеб,** кансервы, **кукурузныя палачкі** [4]**.**

*Настаўнік.* Вы справіліся з заданнем! Вядома, гэта не ўсе дасягненні, якімі варта ганарыцца, толькі невялікая частка. Усе грамадзяне Беларусі стараюцца, каб наша краіна стала яшчэ прыгажэйшай і багацейшай.

**Памятныя мясціны Дадатак 8.** Помнік землякам в.Ганцавічы, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; Курган Славы ва ўрочышчы Горкі, Ганцавіцкі раён; Брэсцкая крэпасць-герой [4]. **Слайд 5**

*Настаўнік.* У Беларусі шмат прыгожых куточкаў! Іх не злічыць. Але ёсць славутасці, якія ведае кожны. Разам з капітанамі адправімся ў памятныя мясціны Рэспублікі Беларусь. Неабходна паказаць і назваць помнікі культуры і архітэктуры. Якія з іх знаходзяцца ў Брэсцкай вобласці? У Ганцавіцкім раёне?

**Знакамітыя людзі (Дадатак 9). Слайд 6**

*Настаўнік.* Беларуская зямля славіцца сваімі людзьмі. Многіх з іх ведаюць ва ўсім свеце. Каманды павінны разабрацца хто ёсць хто. Суаднясіце фотаздымак, прозвішча і імя знакамітых беларусаў.

**Вядомыя людзі малой радзімы. Слайд 7**

*Настаўнік.* У кожнага чалавека на зямлі ёсць месца, дзе ён нарадзіўся, упершыню ўбачыў матуліны вочы і ласкавае сонца. Гэта малая радзіма. Як называецца гэта месца для нас?

Малая радзіма – гэта часцінка нашай вялікай краіны - Беларусі. Перад вамі на дошцы карта Беларусі, а дакладней яе контур. Наша Ганцаўшчына мае вось такую форму. Каго ці што нагадвае наш раён на карце? Па форме абрысы раёна з вышыні нагадваюць рыбку *(дэманструецца контур Ганцавіцкага раёна)*. Давайце размясцім Ганцаўшчыну на карце Беларусі. (*Вучні спрабуюць самастойна вызначыць месцазнаходжанне Ганцавіцкага раёна на карце. Прымацоўваюць контур пры дапамозе магніта)*. **Слайд 8**

*Настаўнік.* На карце з’явілася наша малая радзіма – Ганцавіцкі раён. Зразумела, што за час вучобы ў школе вы будзеце папаўняць свае веды, навучыцеся знаходзіць на карце ўсе гарады, вёскі, рэкі і азёры. Абавязкова знойдзеце на карце і вёску Ганцавічы, як гэта заўсёды рабіў былы дырэктар школы і настаўнік геаграфіі Высоцкі Мікалай Феафілавіч. Звярніце ўвагу на фотаздымкі на экране. Мікалай Феафілавіч – адзін з самых вядомых нашых землякоў. Ён кіраваў хорам, аркестрам духавых інструментаў, які стварыў у нашай школе. Мікалай Феафілавіч так любіў сваю малую радзіму, што нават прысвяціў Ганцавічам вершаваныя радкі *(чытае вучань)*.

Ёсць ціхая вёска над рэчкаю Цною,
Тут людзі сябруюць, працуюць, пяюць.
Палі, сенажаці, лясы, пералескі
Улетку і зімку ім працу даюць.
Сярод гэтай вёскі – школа,

Як Камянецкая Вежа, стаіць.
Тут светлыя класы, спартыўная зала.
Настаўнікі і вучні ў дружбе жывуць.

*Настаўнік.*У нашай вёсцы і зараз жывуць і працуюць цудоўныя людзі. Многіх з іх за залатыя рукі ведаюць і паважаюць усе вясковыя жыхары, сярод такіх вядомых людзей і вашы родныя, мае дарагія вучні. Паслухаем паведамленні пра майстроў-землякоў.

*Мелехавец Констанцін* **(Слайды 9-10)**:

– Мой дзядзька Блінкоўскі Анатолій Эдуардавіч – сапраўдны майстар на ўсе рукі! Ён сплёў не адну сотню кашоў. Кошыкі, зробленыя рукамі дзядзькі Толі, зручныя і лёгкія, вельмі прыгожыя. Ён пляце іх з лазы, са стужкі, шпагату. З такімі кошыкамі з задавальненнем ходзяць па грыбы, капаюць у іх бульбу, збіраюць садавіну. Палюбуйцеся, якія выдатныя кошыкі атрымліваюцца ў майго дзядзькі!

*Занька Арцём* **(Слайды 11-12)**:

– Пра любімую бабулю Валю я магу расказваць бясконца. Занька Валянціна Васільеўна ўжо шмат гадоў кіруе адзіным у раёне Домам народнай творчасці. Бабулечка вельмі таленавітая. Яна стварае цуды з саломкі. Пляце капелюшы, посуд, кветкі, званочкі. З выставамі сваіх саламяных вырабаў аб’ехала ўсю Беларусь, пабывала на Славянскім базары і ў Нацыянальнай бібліятэцы. Мае шмат узнагарод. Але самай галоўнай узнагародай лічыць павагу сваіх землякоў.

*Муха Максім* **(Слайды 13-14)**:

– Усе мае аднакласнікі сустракаліся з маім дзядулем. Бо Муха Мікалай Мікалаевіч – наш настаўнік працоўнага навучання. Ён ведае, як пабудаваць добры дом. Не раз ствараў трывалыя падмуркі, моцныя сцены і надзейныя дахі. Дзядуля – майстар цяслярнай, сталярнай, такарнай справы. Выдатныя ў яго атрымліваюцца работы: дасканалыя, акуратныя. Мікалай Мікалаевіч робіць драўляныя цацкі, падстаўкі для кветак, цудоўныя столікі, альтанкі. Дома пастаянна з вялікім цярпеннем нешта выпільвае, шліфуе. Да яго за дапамогай часта звяртаюцца аднавяскоўцы. Сапраўды, у яго залатыя рукі!

**Слайд 15**

*Настаўнік.* Майстры нашай вёскі Валянціна Васільеўна і Мікалай Мікалаевіч падрыхтавалі атрыбуты для гульні, у якую вельмі любілі гуляць раней у вёсцы Ганцавічы. Давайце паспрабуем паказаць свой спрыт, уменне дапамагаць адзін аднаму ў гульні **“Кійкі”.**

*Праводзіцца гульня “Кійкі”.*

*Пара вучняў павінна памяняцца месцамі. Пры гэтым адзін вучань адпускае кіёк (драўляную палачку), за які трымаўся рукой, а другі стараецца не дапусціць падзення, павінен ухапіць кіёк.*

**Родныя вуліцы (Дадатак 10)**

*Настаўнік.* Пастаянна вы ходзіце па вуліцах роднай вёскі. Некаторыя вуліцы Ганцавічаў названы прозвішчамі Героеў Савецкага Саюза. Кожная каманда атрымала пазл. Давайце збяром пазлы і раскажам гасцям пра вуліцы герояў.

*Вучні прымацоўваюць да дошкі пазлы. Пазнаюць вуліцу па ўстанове, якая на ёй знаходзіцца. Зачытваюць інфармацыю пра асобу, у гонар якой названа вуліца.*

*Настаўнік.* Гавораць, калі чалавек шчаслівы, ён спявае. Мы жывём пад мірным небам у роднай вёсцы са сваімі бацькамі. І, канечне ж, маем права паспяваць і патанцаваць.

*Дзеці выконваюць песню А.Піппер "Дзяўчынка-беларусачка". Робяць простыя танцавальныя рухі.*

*Настаўнік.* Пакуль вы весела і дружна спявалі і танцавалі, Жэўжык і Кірыліца апынуліся на паветраным шары. Яны вельмі ўдзячны вам за дапамогу і хочуць разам з вамі палюбавацца прыгажосцю і велічнасцю любімай краіны – Беларусі.

*Відэафільм "Дарагая Беларусь" [6]*

**3. Заключны этап. Рэфлексія. Слайд 16**

**Воблака слоў "Скарбы Радзімы" (Дадатак 11)**

*Настаўнік.* Звернемся да тэмы занятка – "Край свой родны абыду, скарбы розныя знайду". У воблаку слоў знайдзіце і прачытайце, адно ці два словы – самыя галоўныя для вас скарбы, аб якіх мы гаварылі на класнай гадзіне.

*Настаўнік.* Кожны з нас – часцінка Беларусі,
Раса складаецца з расінак,
З кропелек пары – туман.
Пясок – з драбнейшых пясчынак.
Беларусь – з беларусаў, з нас.

Будзьце дастойнымі грамадзянамі сваёй Радзімы, любіце, абараняйце, захоўвайце яе!

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Ермак, Т.В. Люблю Беларусь сваю родную / Т.В.Ермак //Пачатковая школа. – 2022. – № 5. – С.45–48.

2. Практыкаванне сурвэтка. Інтэрнэт-крыніца, рэжым доступа: https://infourok.ru/klasnaya-gadz%D1%96na-radz%D1%96my-kraj-moj-belarus-4028491.html Дата доступа: 15.11.2022 г.

3. Н. М. Масалович. Путешествие по Беларуси. Иллюстративный материал. Інтэрнэт-крыніца, рэжым доступа: https://p-shkola.by/blog/2022/multimediynoe-prilozhenie-7-2022/ Дата доступа: 15.11.2022 г.

4. Пачатковая школа, № 5, 2022, малюнкі - Мультимедийное приложение №5 / 2022 с. 47-48

5. Зоя Ковалевич, социальная сеть “ВКонтакте”: mood || учитель / личный блог (выкарыстаны гексы “Год исторической памяти”). Режим доступа: https://vk.com/teacher_blogg). Дата доступа: 15.11.2022 г.

6. Відэахосцінг Youtube. Рэжым доступа: https://www.youtube.com/watch?v=BXP_-Dgbyh4) Дата доступа: 15.11.2022 г.

7. Масалович, Н.М. Путешествие по Беларуси / Н.М.Масалович //Пачатковая школа. – 2022. – № 7. – С.27–30.